Два дні ў Доме літаратара — 12 і 13 красавіка — ішла нарада старшынь саветаў рэктараў ВНУ краіны, на якой быў заслухан шэраг дакладаў па праблемах дзейнасці вышэйшай школы. Аб рабоце савета рэктараў г. Мінска расказаў у сваім выступленні рэктар БДУ імя У. І. Леніна член-карэспандэнт АН БССР прафесар У. М. Сікорскі.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 14 КРАСАВІКА 1977 г.

№ 13 (1163)

Цана 2 кап.

## ВІНШУЕМ!

**Калектыў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна горача віншуе з выбраннем акадэмікам АН БССР Л. В. ВАЛАДЗЬКО, прарэктара БДУ па навуковай рабоце і членам-карэспандэнтам АН БССР Я. А. ІВАНОВА, дэкана факультэта прыкладной матэматыкі БДУ.**

Сям'я правадзейных членаў і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі навук БССР папоўнілася новымі прадстаўнікамі беларускай навукі.

На сесіі агульнага сходу АН БССР, які адбыўся 8 красавіка, акадэмікамі Акадэміі навук рэспублікі выбраны таксама Р. І. Салаухін (тэхнічная фізіка), Р. Г. Гарэцкі (геалогія), М. В. Бірыла (моваўнаўства), членамі-карэспандэнтамі — У. А. Пілiловіч (квантавая электроніка), В. П. Грыбкоўскі (тэарэтычная фізіка), В. В. Клубовіч (тэхнічная фізіка), А. М. Шырокаў (кібернетыка), У. С. Салдатаў (фізічная хімія), Ю. М. Астроўскі (біялагічная хімія), П. Ц. Петрыкаў (гісторыя СССР), Я. М. Бабосаў (тэорыя навуковага камунізму).

Сесія агульнага сходу АН БССР у адпаведнасці са статутам АН БССР зацвердзіла кіраўнікоў навуковых устаноў, выбраных на агульных сходах аддзяленняў навук.

## МЭТАНАКІРАВАНАСЦЬ



Вучэбна-даследчая работа студэнтаў — адна з важных і вельмі дзейсных форм падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Яна ў многім садзейнічае фарміраванню ў іх навуковага марксісцка-ленінскага светапогляду, развіццю творчых здольнасцей і навыкаў да працы, самастойным навуковым даследаванням, дапамагае выхаванню актыўных, усебакова развітых будаўнікоў камунізму. Але гэта форма становіцца такой не сама па сабе, а ў выніку мэтанакіраванай арганізацыі і правядзення цэлай сістэмы мерапрыемстваў па развіццю ініцыятывы і актыўнасці студэнтаў у даным напрамку.

Кафедра навуковага камунізму БДУ імя У. І. Леніна набыла пэўны вопыт у арганізацыі і правядзенні вучэбна-даследчай работы са студэнтамі. Сутнасць яго ў тым, што вучэбная і навукова-даследчая работа студэнтаў вядзецца ўсімі выкладчыкамі адначасова, па адзіных планах, цесна ўвязваецца з вучэбным працэсам і дапаўняе яго. На кафедры распрацаваны і перыядычна ўзнаўляюцца тэксты лекцый, планы семінарскіх заняткаў і праграмы спецкурсаў, павышаецца іх навуковы ўзровень, складзена прыкладная тэматыка рэфератаў і дакладаў па праблемах навуковага камунізму. У планах семінарскіх заняткаў для студэнтаў дзённага і вячэрняга навучання рэкамендуецца да кожных заняткаў, акрамя асноўных пытанняў, тры — пяць тэм прыкладных дакладаў і рэфератаў па разглядаемай праблеме. Гэта дазваляе лепш улічваць профіль факультэта, спецыялізацыю студэнтаў і значна актывізаваць іх удзел у вучэбна-даследчай рабоце кафедры. Цяпер у гэтай рабоце ўдзельнічае большасць студэнтаў IV і V курсаў усіх факультэтаў універсітэта, у тым ліку і замежныя студэнты. У немалой ступені гэтаму садзейнічае таксама ўвядзенне дзяржаўнага экзамена па навуковаму камунізму і грамадска-палітычнай практыцы.

У апошнія гады кафедра значна актывізавала вучэбна-даследчую работу студэнтаў, асабліва напісанне імі дакладаў і рэфератаў, падрыхтоўку навуковых паведамленняў па праблемах навуковага камунізму. У кожнай вучэбнай групе на працягу года рыхтуецца і абмяркоўваецца на семінарскіх занятках 12—15 дакладаў і рэфератаў.

Асаблівай папулярнасцю ў студэнтаў карыстаюцца паточныя канферэнцыі па праблемах камуністычнага выхавання працоўных і, у прыватнасці, моладзі, а таксама па актуальных пытаннях сучаснай ідэалагічнай барацьбы. На такіх канферэнцыях заслухоўваецца звычайна 8 — 10 дакладаў і рэфератаў. Усё гэта дазваляе не толькі шырока прыцягваць студэнтаў да работы над творамі класікаў марксізму-ленінізму, партыйнымі і савецкімі дакументамі і матэрыяламі, але і прымушае іх адказна адносіцца да гэтай работы, глыбей разумець падзеі ўнутранага і міжнароднага жыцця, становіцца актыўнымі ўдзельнікамі барацьбы за камунізм.

Лепшыя са студэнцкіх рэфератаў і дакладаў дапрацоўваюцца і разам са спецыяльна выконваемымі работамі ператвараюцца ў паўнацэнныя студэнцкія навуковыя работы, якія затым прадстаўляюцца на навуковыя канферэнцыі і конкурсы. Цяпер у гэтай рабоце на кафедры ўдзельнічаюць звыш 100 студэнтаў усіх факультэтаў універсітэта, прычым кожны выкладчык кіруе напісаннем 2—3 навуковых работ. Неабходна адзначыць, што ў даследаваннях па праблемах навуковага камунізму разам са студэнтамі гуманітарных факультэтаў удзельнічаюць студэнты прыродазнаўчых факультэтаў, а таксама замежныя студэнты. У выніку на рэспубліканскі тур IV Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху было прадстаўлена 37 навуковых работ. Паглыбіліся даследуемыя праблемы, павысіўся іх ідэйна-тэарэтычны ўзровень. У выніку з 11 навуковых работ дзве ўдастоены дыпломаў I і II ступені.

**І. СМАЛЬЦАР,**
**кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.**

## НА ПАРАДКУ ДНЯ — МАРАЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ





**Нядаўна адбыўся пленум камітэта камсамола, прысвечаны пытанням маральнага выхавання студэнтаў. На пленуме прысутнічалі прарэктар БДУ У. Івашын, загадчык студэнцкага аддзела абкома ЛКСМБ С. Пагарэлаў, сакратар Кастрычніцкага РК ЛКСМБ Л. Ярашэвіч, намеснік сакратара парткома БДУ У. Навумовіч, а таксама сакратар камітэта Саюза свабоднай нямецкай моладзі Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера В. Кнаус.**

**З дакладам аб ролі, задачах і асноўных напрамках работы камсамольскіх арганізацый БДУ па маральнаму выхаванню студэнтаў выступіў сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Тозік. У спрэчках па дакладу прынялі ўдзел камсамольскія работнікі У. Грыняк, Г. Хухлындзін, Н. Шаўчэнка, У. Карагін, М. Лаўрыновіч і іншыя. Адбылася жывая, зацікаўленая размова, прысвечаная камуністычнаму выхаванню моладзі.**

**Быў зацверджан комплекс мерапрыемстваў камітэта камсамола БДУ па дастойнай сустрэчы 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.**

**НА ЗДЫМКАХ: выступае сакратар камітэта камсамола БДУ А. ТОЗІК.**

Фота **А. Галавачовай.**

# ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА—ЮБІЛЕЮ КАСТРЫЧНІКА

## ПАД ТАКІМ ДЭВІЗАМ ПРАЙШЛА НАРАДА СТАРШЫНЬ САВЕТАЎ РЭКТАРАЎ ВНУ КРАІНЫ

КАРОТКАЕ ІНТЭРВ'Ю

## ПРАБЛЕМЫ ПРАКТЫКІ

**Аб тым, як арганізуецца вытворчая практыка і кантроль за стажыроўкай выпускнікоў, якія праблемы рашаюцца ў гэтым напрамку, расказаў у гутарцы з нашым карэспандэнтам старшыня савета рэктараў ВНУ г. Днепрапятроўска, рэктар Днепрапятроўскага горнага інстытута, доктар тэхнічных навук прафесар Уладзімір Іванавіч АНІШЧАНКА:**

— Праблема арганізацыі вытворчай практыкі і стажыроўкі выпускнікоў, на наш погляд, заключаецца ў працягванні навукова-даследчай работы, якую студэнты вядуць у працэсе вучобы, непасрэдна ў час практыкі або працы на прадпрыемствах. Часам атрымліваецца так, што пасля ВНУ студэнт спыняе навукова-даследчую работу. Выпускнікі гэтыя зводзяць да нуля тую каласальную работу, якую праводзяць выкладчыкі састаў, грамадскія арганізацыі ў ВНУ па арганізацыі навуковых даследаванняў. Працягваць даследчую работу на прадпрыемствах — галоўная праблема.

Другая праблема звязана са скарачэннем тэрмінаў вытворчай практыкі, якое прадугледжана новымі вучэбнымі планамі. Задача зараз у тым, каб захаваць высокую практычную падрыхтоўку студэнтаў шляхам яе інтэнсіфікацыі, гэта значыць праводзіць тую ж практыку ў больш сціслыя тэрміны.

КАРОТКАЕ ІНТЭРВ'Ю

## Увага—творчасці

**Аб тым, як арганізуецца навукова-даследчая работа ў Горкаўскім дзяржаўным універсітэце, расказвае старшыня савета рэктараў ВНУ г. Горкага доктар тэхнічных навук прафесар Андрэй Рыгоравіч УГОДЧЫКАЎ:**

— Наш універсітэт з дня яго стварэння ў 1918 годзе, як адзін з першых універсітэтаў, створаных пры Савецкай уладзе, развіваецца своеасабліва. Гэта, у асноўным, прыродазнаўчы універсітэт. У ім не знайшлі свайго развіцця гуманітарныя факультэты. Пачынаючы з 1932 года ва універсітэце было арганізавана 5 навукова-даследчых інстытутаў. Зараз ва універсітэце 4 НДІ, адзін стаў самастойным— інстытут радыёфізічных праблем.

Наша навуковая работа абапіраецца на садружнасць кафедр і роднасных лабараторый НДІ. Тут працуе больш тысячы супрацоўнікаў, таму ў нас ёсць пэўныя магчымасці, каб выкарыстаць НДІ для арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў.

Большасць нашых студэнтаў займаюцца даследчай працай. Універсітэт выконвае больш 5 млн. навуковых даследаванняў па гасдагаворнай тэматыцы, 3 млн. па дзяржбюджэтнай тэматыцы.

Асноўнае ў нашай рабоце — павышэнне ўвагі да творчай і навуковай працы ў працэсе навучання.

## ЦІКАВА ПАЗНАЁМІЦЦА

**Сваімі ўражаннямі аб наведанні нашага універсітэта дзеліцца з чытачамі ўдзельнік нарады старшынь саветаў рэктараў ВНУ рэктар Марыйскага дзяржаўнага універсітэта, доктар біялагічных навук прафесар Віктар Эдуардавіч КАЛО:**

— Я пазнаёміўся з вашай фундаментальнай бібліятэкай, якая мне вельмі спадабалася. Работа тут добра арганізавана. Бібліятэка багатая: 1 млн. 400 тыс. тамоў, шмат чытальных залаў, якія прадумана размешчаны. Наколькі я ведаю, ёсць бібліятэкі на кафедрах — «перасоўкі», на факультэтах.

Мне, як прадстаўніку аднаго з самых маладых універсітэтаў, які існуе толькі 5 год, вельмі карысна было пазнаёміцца з вопытам вашай работы. Наогул, такое знаёмства з універсітэтамі краіны, зносіны з імі даюць нам больш, чым перапіска або заслухоўванне дакладаў. Як гавораць, лепш адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць.

Віктар Эдуардавіч пабываў на біялагічным факультэце, азнаёміўся з тэхнічнымі сродкамі навучання біёлагаў.

# Вучыць вучыцца

**Аб выкарыстанні навуковых даных пры арганізацыі вучэбнага працэсу, метадах навучання ў сучасных універсітэтах расказвае член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР, доктар псіхалогіі прафесар Н. ТАЛЫЗІНА.**

Апошнія дзесяцігоддзі азнаменаваліся пошукам шляхоў павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу. Даследаванні вядуцца ва ўсіх развітых краінах, шмат робіцца і ў нас. Найбольш перспектыўнымі, на нашу думку, з'яўляюцца даследаванні савецкіх псіхолагаў, прысвечаныя ўкараненню метадаў сістэмна-структурнага аналізу пры пабудове вучэбных прадметаў, а таксама работы па мадэліраванню абагульненых метадаў мыслення, якія б забяспечылі спецыялісту шырокую арыентыроўку ў адпаведнай галіне навукі і тэхнікі. Гэтыя даследаванні больш як дваццаць гадоў назад пачалі доктар псіхалогіі П. Я. Гальперын, яго супрацоўнікі і паслядоўнікі. Вядома, што аб'ём матэрыялу, які неабходна вывучыць сучаснаму студэнту, непамерна вялікі і памеры яго няспынна растуць. Справіцца з лавінападобным нарастаннем інфармацыі немагчыма, уносячы толькі прыватныя змяненні ў вучэбныя праграмы або здзяйсняючы асобныя перастаноўкі ў іх.

У сувязі з гэтым паўстае пытанне: ці трэба вывучаць кожную прыватную з'яву, ці мэтазгодна фарміраваць у будучых спецыялістаў мноства метадаў мыслення, прыгодных у вузка абмежаваных рамках? Ці нельга навучаць так, каб студэнт, не трацячы часу на кожныя прыватныя заняткі асобна, у той жа час быў бы падрыхтаван да самастойнага аналізу ўсіх іх, прычым не толькі вядомых цяпер, але і тых, якія паявяцца ў будучым.

Даследаванні П. Я. Гальперына паказалі, што вырашэнне гэтай задачы зусім рэальнае, больш таго, яе вырашэнне дае магчымасць не толькі ліквідаваць перагрузкі студэнтаў, але і істотна павысіць надзейнасць навучання.

Для гэтага неабходна ў кожнай галіне: па-першае, усё мноства вядомых прыватных з'яў разгледзець як сістэму, знайсці той варыянт, які ляжыць у яе аснове і праяўляецца ў кожнай з прыватных з'яў; па-другое, пабудаваць метад, які абапіраецца на тое агульнае, што ляжыць у аснове ўсіх гэтых прыватных выпадкаў.

Калі гэта ўдаецца зрабіць, то вывучэнне мноства прыватных з'яў замяняецца вывучэннем толькі некаторых з іх. Пры гэтым яны выступаюць не як самастойныя прадметы засваення, а як сродак засваення агульнага, істотнага, на якое студэнта арыентуюць пры аналізе кожнай прыватнай з'явы. Прыватных з'яў уводзіцца столькі, колькі неабходна для засваення метаду, разлічанага на любую прыватную з'яву данай сістэмы. Так, савецкія даследчыкі паказалі, напрыклад, што для засваення пунктуацыі рускай мовы няма патрэбы завучваць больш як 100 правілаў, кожнае з якіх да гэтага часу вывучаецца асобна, для кожнага з якіх фарміруецца ўменне карыстацца ім. Разгляд усіх зафіксаваных у гэтым мностве прыватных выпадкаў як сістэмы паказаў, што ўсе яны—сутнасць праяўлення трох функцый, якім служаць знакі прыпынку: функцыі злучэння (слоў або сказаў), функцыі выдзялення (слоў або сказаў) і функцыі раздзялення (слоў або сказаў). Інакш кажучы, усе гэтыя 100 з лішнім правілаў могуць быць прадстаўлены як тры падсістэмы. З гэтай прычыны было б дастаткова навучыць толькі ўменню распазнаваць тры названыя функцыі, каб беспамылкова расстаўляць знакі прыпынку, не завучваючы пры гэтым ніводнага канкрэтнага правіла.

Другое даследаванне паказала, што пры вывучэнні матэматычнага аналізу няма неабходнасці вывучаць кожную прыватную функцыю асобна. Дастаткова выдзеліць інварыянт, які ляжыць у аснове любой функцыі, і яго зрабіць прадметам вывучэння. Для засваення гэтага інварыянта трэба ўвесці ўсяго толькі некалькі прыватных функцый, працуючы з якімі студэнты засвойваюць метад, прыгодны для аналізу любой функцыі гэтага класа.

Такім чынам, для ліквідацыі перагрузкі студэнтаў неабходны новы спосаб захавання інфармацыі: замест захавання вялікай колькасці гатовых ведаў захоўваць метад, які дае магчымасць самастойна аналізаваць і аднаўляць усю сістэму прыватных з'яў. Так, пры вывучэнні хіміі студэнты, узброеныя метадам, адэкватным сутнасці, што ляжыць у аснове вялікай колькасці прыватных спалучэнняў, самастойна аналізуюць любое з прапанаваных ім упершыню. Веданне метаду пазбаўляе іх ад захавання ў памяці вялікай колькасці гатовых формул і ўраўненняў: у выпадку неабходнасці яны складаюць іх самі. Змадэліраваны метад, які з'яўляецца аналагам таго, якім карыстаўся Д. І. Мендзялееў, прадказваючы невядомыя элементы сваёй славутай перыядычнай сістэмы. Узброенасць гэтым метадам дала магчымасць перадкрыць сістэму Д. І. Мендзялеева нават вучням сярэдняй школы.

Шырокае ўкараненне гэтых даследаванняў у практыку універсітэцкай адукацыі дае магчымасць унесці ў яе карэнныя ўдасканаленні, рэзка ўзняць яе эфектыўнасць. А вырашэнне гэтай задачы патрабуе сумесных даследаванняў псіхалогіі, спецыялістаў па сістэмнаму аналізу і спецыялістаў у галіне адпаведных вучэбных дысцыплін. Гэта пацягне за сабой сур'ёзныя змяненні ў метадах навучання: асноўны аўдыторны час студэнт павінен траціць на рашэнне задач — метад можна засвоіць, толькі прымяняючы яго.

# ЛЮБЯЦЬ СПОРТ У ТБІЛІСІ

**Аб фізічным выхаванні студэнтаў, спартыўна-масавай і абаронна-патрыятычнай рабоце, якая праводзіцца ў Тбіліскім дзяржаўным універсітэце, расказвае нашым чытачам прарэктар па вучэбнай рабоце ТДУ, кандыдат філасофскіх навук Зураб Іраклієвіч ПАРАКІШВІЛІ.**

ТДУ з'яўляецца зачынальнікам, ініцыятарам у рэспубліцы «Студэнцкіх дзён», якія па сваёй накіраванасці зліваюцца з грамадска-палітычнай практыкай.

Вялікая ўвага ўдзяляецца ў ходзе «Студэнцкіх дзён» мерапрыемствам, якія праводзяцца ў падшэфных заводскіх калектывах, воінскіх часцях, у калгасах і саўгасах рэспублікі.

На працягу 5 дзён праводзяцца спаборніцтвы па 15 відах спорту. Звычайна ў іх удзельнічаюць звыш 1000 чалавек.

Цікава, на нашу думку, тое, што ў якасці суддзяў па некаторых відах спорту выступаюць вядомыя вучоныя, напрыклад, акадэмік Н. Кецхавелі, акадэмік А. Цагарэлі і інш. Мы лічым, што гэта вельмі дзейсная форма прапаганды спорту і фізічнай культуры сярод моладзі.

У праграме прадугледжаны масавы турысцкі паход студэнтаў і выкладчыкаў з узыходжаннем на гару Удзо. У мінулым годзе ў такім паходзе прыняло ўдзел каля 3000 чалавек.

Ваенна-патрыятычная і абаронна-масавая работа ў ВНУ ўсім сваім зместам накіравана на выхаванне ў студэнтаў такіх якасцей, як высокая ідэйнасць, вернасць справе камунізму, любоў да Савецкай Радзімы, рашучасць і мужнасць, стойкасць і смеласць, пільнасць і дысцыплінаванасць.

Каардынацыя агульных намаганняў рэктарата, парткома, партыйнай і камсамольскай арганізацый, ваеннай кафедры, камітэта ДТСААФ, таварыства «Веды» ў рамках універсітэта дазваляе дабівацца найбольшага эфекту у гэтай рабоце.

У нас быў арганізаван агляд-конкурс на лепшае нагляднае афармленне аўдыторый і лабараторый ваенных кафедр і кафедр грамадзянскай абароны.

Аўтарытэтнае журы, якое складаецца з членаў камісіі савета па ваенна-патрыятычнаму выхаванню і абаронна-масавай рабоце, азнаёмілася з радам плакатаў, насценгазет, дзеючых макетаў, табліц і дыяграм, наглядных дапаможнікаў, стэндаў і г. д. Агляд-конкурс, які прайшоў з вялікім поспехам, садзейнічаў значнаму павышэнню ўзроўню нагляднай агітацыі, афармленню і тэхнічнаму аснашчэнню кафедр.

Трывалыя дзелавыя кантакты наладзіліся ў нас з рэспубліканскім таварыствам «Веды», яго пярвічнымі арганізацыямі. Савет рэктараў у 1976-77 навучальным годзе арганізаваў сумесна з прэзідыумам таварыства цыкл лекцый на тэмы: «КПСС — арганізатар абароны сацыялістычнай Айчыны», «XXV з'езд КПСС аб умацаванні абараназдольнасці краіны, баявой магутнасці Савецкіх Узброеных Сіл».

У нас нарадзілася думка падрыхтаваць кнігу «Жанчыны універсітэта ў Вялікай Айчыннай вайне». Гэта кніга ўжо выпушчана і стала вельмі папулярнай сярод нашай моладзі.

Зразумела, гэтымі асноўнымі момантамі не вычэрпваецца ўвесь змест нашай работы. Шэраг важных праблем яшчэ чакае свайго рашэння, і ў планах работы на 1977-78 навучальны год ім удзелена значная ўвага.

# СВЯТА БУДЗЕ ТРАДЫЦЫЙНЫМ

Упершыню так урачыста прымалі ў свае рады новае папаўненне супрацоўнікі універсітэцкай бібліятэкі. Зала была святочна аформлена ў гонар дня пасвячэння ў бібліятэкары, запрошаны госці.

Адкрыла свята дырэктар бібліятэкі Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская выступленнем «Бібліятэка як адно з асноўных звенняў у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай школе».

Шмат цёплых слоў у адрас бібліятэкараў было сказана прарэктарам А. Малышавым. Ён пажадаў нам усім, і новым і старым супрацоўнікам, заўсёды з усмешкай сустракаць адзін аднаго і такую ж усмешку дарыць сваім наведвальнікам. Затым поспехаў у працы нам пажадаў начальнік ВЦ А. Пальцаў. Яму вельмі спадабалася наша свята, і ён выразіў надзею, што наша цікавае пачынанне знойдзе водгук і ў іх калектыве.

Сваімі ўспамінамі аб рабоце бібліятэкі БДУ ў пасляваенныя гады падзялілася Р. Любіна, якая была ў той час яе дырэктарам.

З цікавасцю выслухалі прысутныя паведамленне намесніка дырэктара Р. Пустаход аб перспектывах развіцця бібліятэкі. Загадчыца аддзела ДБА З. Рахманчык цёпла, захапляюча і нават крышачку з гумарам гаварыла аб агульнай нашай прафесіі — прафесіі бібліятэкара.

Ад імя нашых маладых пачынаючых спецыялістаў выступіла Т. Куніцкая. Яна, у прыватнасці, сказала: «Я вельмі люблю сваю прафесію і не здраджу ёй ніколі».

А колькі выдумкі, добразычлівасці і мяккага гумару было ў прывітаннях кожнага аддзела! Мы і не чакалі, што ў нашых бібліятэчных супрацоўнікаў столькі талентаў!

Нарэшце — кульмінацыйны момант свята — рытуал пасвячэння маладых спецыялістаў у бібліятэкары: ім уручаюцца пашпарты спецыялістаў, затым загадчык аддзела камплектавання Л. Зрубовіч дорыць новай змене прыгожа аформленую, вялізную разгорнутую кнігу з пажаданнямі маладым бібліятэкарам.

У заключэнне дырэктар бібліятэкі І. Арэхоўская павіншавала маладых бібліятэкараў з пачаткам іх працоўнай дзейнасці і зачытала тэкст «запаведзі бібліятэкараў».

Закончылася свята канцэртам мастацкай самадзейнасці.

Мы ўпэўнены, што з гэтага часу такія дні пасвячэння ў бібліятэкары стануць у нас традыцыйнымі.

**Т. МЕЛЬНІКАВА,**
**бібліятэкар.**

# Стэнды-дапаможнікі

**АБМЕН ВОПЫТАМ**

Спецыфіка вучэбнага курса батанікі заключаецца ў тым, што ён змяшчае вялікі па аб'ёму матэрыял, які падлягае завучванню і запамінанню. Адным з магчымых шляхоў павышэння эфектыўнасці гэтай работы з'яўляецца арганізацыя міжвольнага запамінання вучэбнага матэрыялу. Для гэтай мэты па ўсіх раздзелах курса батанікі калектывам выкладчыкаў кафедры батанікі Харкаўскага сельскагаспадарчага інстытута імя В. В. Дакучаева аформлены аб'ёмныя вучэбна-ілюстрацыйныя стэнды.

Тэматыка стэндаў разнастайная: «Анатомія раслін», «Водарасці», «Лішайнікі», «Імхі», «Хвашчы», «Дзераза», «Папараці», «Голанасенныя», «Плады» і г. д., усяго 35 стэндаў. Памеры стэнда — 130×90×10 (см).

Для прыкладу возьмем стэнд «Дзераза». На ім дадзена: кароткая і дакладная характарыстыка дзеразы, класіфікацыя, філагенетычныя сувязі, цыкл развіцця, гербарныя ўзоры (15 відаў), месцавырастанне і значэнне дзеразы. Малюнкі і гербарныя ўзоры дадзены аб'ёмна. Аб'ёмныя малюнкі на ўсіх стэндах выконваліся акварэльнай фарбай, якая фіксавалася тушшу. Гербарныя ўзоры вытрымліваліся пад парам, потым з дапамогай пульверызатара пакрываліся маслянай фарбай, якая папярэдне разбаўлена растваральнікам № 4. Пасля гэтага гербарныя ўзоры з дапамогай пульверызатара пакрываліся 3—4 разы лакам.

Дадаткова маюцца навукова-папулярныя стэнды: «Здзіўляючы свет раслін», «Раслінны свет акіяна», «Лес і жыццё», «Паэты аб прыродзе», «Расліны-лекары» і г. д.

Яркае, аб'ёмнае і прыгожае афармленне стэндаў абуджае цікавасць студэнтаў інстытута і прывівае любоў да раслін, да прыроды.

З пяцігадовага вопыту работы мы пераканаліся, што такія стэнды служаць эфектыўным дапаўненнем да вучэбнага працэсу. Калі без нагляднасці сярэдні бал паспяховасці студэнтаў па батаніцы быў 3,7, то зараз ён узрос да 4,5. Прымяненне такіх стэндаў надае працэсам навучання і выхавання новыя якасці, актывізуе і арганізуе самастойную работу студэнтаў, садзейнічае ўдасканальванню вучэбнага працэсу на кафедры.

**В. ЛЫСЕНКА,**
**кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Харкаўскага СГІ імя В. В. Дакучаева.**

# «Каракумы» на журфаку




На журфаку падрыхтавана новая фотавыстаўка студэнта 5 курса завочнага аддзялення Я. Пясецкага — «Каракумы». Здымкі былі зроблены па заданню газеты «Правда», у якасці спецыяльнага карэспандэнта якой Я. Пясецкі быў у Туркменскай ССР. (Прадстаўляем вашай увазе некалькі яго здымкаў).

(Заканчэнне на 4-й стар.).



# СЁННЯ — СТУДЭНТЫ, ЗАЎТРА — СУПРАЦОЎНІКІ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытут цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава адзін з вядучых у краіне. Сярод яго супрацоўнікаў многа выпускнікоў БДУ, політэхнічнага і радыётэхнічнага інстытутаў.

— За апошнія гады рады даследчыкаў папаўняюцца ў асноўным выпускнікамі БДУ, — расказвае В. А. Драгун, які выконвае абавязкі вучонага сакратара інстытута.— Штогод да нас прыходзяць на практыку студэнты фізічнага факультэта універсітэта. Яны не толькі знаёмяцца з інстытутам, але і прымаюць актыўны ўдзел у навуковай рабоце: пішуць курсавыя і дыпломныя работы.

Зараз у ІЦМА працуюць сем выпускнікоў фізфака БДУ. Мы папрасілі іх падзяліцца ўражаннямі першых месяцаў работы.

**— Перш за ўсё хацелася б даведацца, чаму вы выбралі менавіта спецыяльнасць цеплафізіка?**

**Таццяна САКАЛОЎСКАЯ:**

— Напэўна, пытанні фізікі, звязаныя з працэсамі пераносу цяпла, энергіі, мне і маім сябрам падабаліся больш. Таму на трэцім курсе пры спецыялізацыі мы пайшлі на кафедру цеплафізікі. І яшчэ, хацелася паспрабаваць свае сілы ў даследаваннях, якія праводзіў інстытут, займаючыся распрацоўкай тэарэтычных і практычных пытанняў цепла- і масаперадачы.

Усе сямёра, калі былі яшчэ студэнтамі, праходзілі практыку ў ІЦМА. Знаёміліся з яго лабараторыямі, пісалі дыпломныя работы пад кіраўніцтвам вопытных супрацоўнікаў. Цяпер былыя студэнты самастойна працуюць у лабараторыях, канструктарскім бюро.

**— Ці сутыкнуліся вы на першым часе самастойнай дзейнасці з цяжкасцямі? Калі яны былі, то якія?**

**Алег АНАСАЎ:**

— Безумоўна, цяжкасці былі. І, мне здаецца, яны непазбежны ў кожнага, хто пачынае працаваць самастойна. На апошніх курсах фізфака нам чыталі лекцыі супрацоўнікі інстытута цепла- і масаабмену, чыталі па тых праблемах, якімі займаліся самі, глыбока і рознабакова даследуючы іх. Вельмі карыснымі былі абагульняючыя курсы.

Першымі жнівеньскімі днямі, калі мы прыйшлі на работу, нас накіравалі ў лабараторыі і канструктарскае бюро. Але размеркавалі без уліку нашай практыкі і тэм дыпломных работ. Пашанцавала толькі Тані Сакалоўскай. Яна працуе ў той лабараторыі, дзе пісала дыпломную. Астатнім жа давялося пачынаць усё нанава. Думаю, што ў далейшым пры размеркаванні будзе ўлічвацца як практыка, так і дыпломная работа.

**— Часта здараецца так, што вельмі цяжка знайсці сваё месца ў калектыве, які ўжо склаўся, сфарміраваўся. Даводзіцца пераадольваць своеасаблівы псіхалагічны бар'ер, нават для чалавека таварыскага. Што вам памагло «прыжыцца» ў калектыве?**

**Аляксандр ПІСАРЧЫК:**

— Галоўнае, я лічу, сумесная праца над канкрэтнай тэмай, праблемай, агульныя мэты і задачы. У інстытуце многа моладзі, якая захапляецца спортам. У нас ёсць добрая секцыя воднага турызму. Сяргей Максіменка і Саша Пятроўскі — заядлыя турысты — воднікі, Алег Анасаў і я захапляемся альпінізмам.

«Прыжыванню» ў калектыве дапамагае таксама і ўдзел у грамадскай рабоце. Уладзімір Мадзяраў, напрыклад,—член «Камсамольскага пражэктара», Сяргей Максіменка — намеснік камсорга аддзела СКБ.

**— Скажыце, калі ласка, над чым вы зараз працуеце?**

**Сяргей МАКСІМЕНКА:**

— Усе мы працуем над цікавымі праблемамі. Таццяна Сакалоўская займаецца лічбавымі метадамі даследавання турбулентнасці. Турбулентнасць — гэта рух вадкасці ці газу, пры якім асобныя часцінкі перамяшчаюцца неўпарадкавана, па складаных траекторыях. Напрыклад, рух паветра ў атмасферы ці вады ў рэках і трубах.

Я займаюся праблемамі гідрадынамікі ферамагнітных вадкасцей. З дапамогай гэтых вадкасцей можна збіраць нафту з паверхні мора, са сценак цыстэрнаў і танкераў. На першы погляд гэта вадкасць як вадкасць. Але калі паднесці да яе паверхні магніт, то яна збіраецца ў... «вожык».

Учарашнія студэнты пакуль што толькі стажоры. Далейшая работа канчаткова пакажа, быць ці не быць ім вучонымі.

Гутарку вяла
**В. ІОСЬКА.**



# ПЕСНІ СЯБРОЎСТВА

За салідарнасць, мір і дружбу — пад такім дэвізам праходзіў фестываль самадзейнасці замежных студэнтаў, стажораў і аспірантаў БДУ, прысвечаны 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Прадстаўнікі 8 краін, 4 кантынентаў дэманстравалі сваю мастацкую творчасць перад студэнтамі БДУ.

Песні і вершы на розных мовах, тэмпераментныя танцы розных народаў прыйшліся па душы гледачам.

Свята адкрыла старшыня савета дружбы, аспірантка з ГДР Таня Міш.

Хор студэнтаў з ГДР выканаў песні савецкага і нямецкага народаў. А вось на сцэне дзяўчына з Польшчы Бажэна Анета. Акампаніруючы сабе на гітары, яна выканала песні на рускай, польскай, англійскай мовах. Вельмі цёпла сустрэлі прысутныя студэнта Чана Нгуена Трана з СРВ, які выканаў песні «Апошні бой», «На крылах ветру». Афрыканскія студэнты пазнаёмілі з песнямі сваіх краін.

Доўга апладзіравалі гледачы і вядучаму фестываля студэнту з ГДР Франку Іленбургу, які выканаў «Алесю» на беларускай мове. Калі ж Сціл Махамед з Гвінеі заспяваў нашу «Кацюшу», а потым «Падмаскоўныя вечары» — уся зала падхапіла знаёмыя мелодыі.

Цікавымі былі выступленні і іншых замежных студэнтаў, аспірантаў і стажораў.

**З. ЯНОВІЧ.**

# РУХАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ І ЗДАРОЎЕ

(Працяг. Пачатак у №№ 8, 9).

**3. Прынцыпы самастойнай трэніроўкі і яе аб'ём.**

Для таго, каб самастойная трэніроўка прыносіла аптымальную карысць, належыць ведаць яе асноўныя прынцыпы.

Перш за ўсё гэта рэгулярнасць заняткаў. Трэніроўкі рэкамендуецца праводзіць не менш трох разоў у тыдзень. Акрамя таго, важным з'яўляецца і працягласць перыяду рэгулярных заняткаў спортам. Найлепшых вынікаў можна дабіцца толькі шляхам шматгадовай трэніроўкі.

Неабходна таксама прытрымлівацца прынцыпу паслядоўнасці, які заключаецца ў паступовым павышэнні фізічнай нагрузкі.

І трэці прынцып — прынцып дазіравання нагрузкі. Аб'ём нагрузкі павінен строга адпавядаць фізіялагічным магчымасцям арганізма, узроўню фізічнага развіцця, полу і ўзросту. Распрацоўка рэкамендацый па аб'ёму мышачнай нагрузкі ў час аздараўленчай трэніроўкі — адна з найменш даследаваных праблем савецкай сістэмы фізічнага выхавання. Аднак ужо ў цяперашні час можна даць шэраг заснаваных на навуковых эксперыментах парад па пытаннях аб'ёму рухальнай актыўнасці ў рэжыме дня чалавека разумовай працы.

Так, напрыклад, для студэнтаў аптымальнымі лічацца заняткі фізічнымі практыкаваннямі на працягу 9—12 гадзін у тыдзень. Даказана, што ў большасці студэнтаў на працягу семестра да пачатку экзаменаў разумовая працаздольнасць падае на 40 працэнтаў, пагаршаецца стан нервовай і сардэчна-сасудзістай сістэм. Вызначаны аб'ём рухальнай актыўнасці дазваляе захаваць добрае здароўе і працаздольнасць.

Прыблізная раскладка часу на фізічную культуру: штодзённая ранішняя гімнастыка — 10—15 мін., хадзьба на свежым паветры—40—50 мін., самастойная трэніроўка —30—40 мін. У выхадны дзень пажадана прагулка на лыжах, выезд за горад.

**У. РЭЙДЗІН,**
**кандыдат педагагічных навук, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.**

# «КАРАКУМЫ» НА ЖУРФАКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

На факультэце журналістыкі стала традыцыяй арганізацыя выставак фотаработ студэнтаў дзённага, вячэрняга і завочнага аддзяленняў. За апошнія дзесяць год дэманстравалася 15 выставак.

Свае фотаработы паказвалі В. Казлоў, А. Кудраўцаў, А. Ласмінскі, Я. Пясецкі, М. Расолька, В. Драчоў і іншыя.

Цікавыя па сваёй кампазіцыі і зместу выстаўкі «Беларускі друк у гады Вялікай Айчыннай вайны», «50 год Беларускага радыё».

Арганізацыяй выставак займаецца ст. выкладчык кафедры тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання Г. З. Бягун. Пад яго кіраўніцтвам у кабінеце фотарэпартажу праводзяцца абмеркаванні здымкаў, рашаюцца пытанні кадрыравання фотаработ.

**Н. ЛЕБЕДЗЕВА.**

# ШТО ВЫ ДОРЫЦЕ?

УСЕ, канешне, памятаюць узрушваючую гісторыю маладой пары з апавядання О'Генры «Дары волхваў». Дэла адрэзала і прадала свае цудоўныя валасы, каб купіць Джыму ланцужок да адзінай яго каштоўнасці — гадзінніка, а Джым, які марыў упрыгожыць валасы Дэлы чарапахавым грэбнем, прадаў свой гадзіннік. Жаданне прынесці радасць каханаму было такім моцным і бескарыслівым, што кожны з іх лёгка расстаўся з тым лепшым, чым валодаў.

Падарунак заўсёды бескарыслівы, ён служыць адлюстраваннем кахання, дружбы, добрых пачуццяў і як бы фіксуе адносіны людзей адзін да аднаго і часта можа выказаць больш, чым іншыя гучныя словы.

Ці павінен падарунак быць карысным, дарагім, патрэбным прадметам? Усё гэта неабавязкова, але рэч, якую дораць, абавязкова павінна несці на сабе вялікую, калі можна так сказаць, «этычную» нагрузку. Яна павінна сведчыць аб тым, што чалавек, выбіраючы яе, думаў аб гусце і жаданні таго, каму яна прызначана, і ўклаў у выбар яе свой асабісты густ, свае адносіны.

Каштоўнасць падарунка, як правіла, ніякага значэння не мае і залежыць толькі ад вашых магчымасцей. Калі тут і ёсць абмежаванні, то яны датычацца толькі дарагіх падарункаў: іх не належыць дарыць людзям, якія, як вам зараней вядома, не могуць адказаць тым жа і ад гэтага будуць адчуваць сябе няёмка.

Можа здарыцца, што чалавек, якому вы хочаце прынесці задавальненне падарункам, валодае абсалютна неразвітым, прымітыўным, на ваш погляд, густам. Дык няўжо вы падарыце гэтаму чалавеку рэч, якая вам самому зусім не падабаецца і выклікае ў вас эстэтычны пратэст? Мабыць, вы так не зробіце. І замест таго, каб падладжвацца пад дрэнны густ сябра, вы пастараецеся, каб ваш з любоўю выбраны падарунак не толькі прынёс задавальненне таварышу самім фактам вашай увагі, але і дапамог бы яму змяніць паняцце аб харастве.

Вы адправіліся на пошукі падарунка, яшчэ не маючы яснага ўяўлення аб тым, які прадмет вы хочаце купіць. На вашым шляху мноства магазінаў —мастацкіх вырабаў і фарфору, галантарэі і тканіны, спартыўных і музычных тавараў, парфюмерыі і віна, садавіны і кветак. У кожным з іх вы можаце знайсці падарунак, але ці любая рэч згадзіцца ў якасці падарунка менавіта для гэтага чалавека і менавіта па гэтай прычыне? Тут многае залежыць ад ступені сваяцкасці або знаёмства, ад узросту людзей, іх інтарэсаў, заняткаў. Чым менш вы звязаны сяброўскімі вузамі з тым, каму збіраецеся зрабіць падарунак, тым менш інтымным і ўтылітарным ён павінен быць. І наадварот, чым больш блізкія сваяцкія ці сяброўскія адносіны, тым менш абмежаванняў у выбары падарунка.

Не толькі ступень блізкасці адносін, але і іх характар адбіваецца на выбары падарунка.

Трэба падумаць і аб узросце людзей, якім вы шукаеце падарунак.

Асаблівую каштоўнасць маюць падарункі, якія ўзбагачаюць нас духоўна, развіваюць наш інтэлект, служаць эстэтычнаму выхаванню. Сярод такіх падарункаў самы універсальны — кніга. Яе можна падарыць любому чалавеку і па любой прычыне. Дарэчы, кнігі, як і кветкі, прыемна атрымліваць у падарунак і наогул без усякай прычыны.

...Закончаны падрыхтаванні да свята, стол накрыт, вы апрануліся і чакаеце сяброў. Як прымаць падарункі? Адзін лічыць, што трэба непрыкметна ўбраць пакет убок і, калі разыйдуцца госці, паглядзець, што ж табе падарылі. Другія, наадварот, думаюць, што трэба тут жа паглядзець падарунак і выказаць свае адносіны да яго. Мы за думку апошніх, таму што загадзя ўпэўнены, што госць патраціў нямала часу і намаганняў, каб прынесці вам задавальненне. Навошта ж крыўдзіць яго няўвагай? Абавязкова паглядзіце, што ён вам падарыў. Мы спадзяёмся, што ў вас хопіць такту не выказаць сваё расчараванне, калі падарунак прыйдзецца вам не па густу. А калі ён вам спадабаецца і ваша радасць будзе шчырай, то для сяброў гэта будзе выдатным узнагароджаннем за свае клопаты.



В. а. рэдактара
В. А. ВОЛЬСКІ.

НАШ АДРАС: Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 02155 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. № 627.